В. Саітава



# Педагог, вучоны, бібліяграфазнавец

**27 мая спаўняецца 70 гадоў з дня нараджэння Васіля Емяльянавіча Лявончыкава – доктара педагагічных навук, прафесара, акадэміка.**

Нарадзіўся Васіль Емяльянавіч у вёсцы Бярозаўка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Пасля заканчэння сямігодкі «на выдатна» ён упэўнена вызначыў свой жыццёвы шлях, звязаўшы яго з культурай. Прафесійную адукацыю атрымаў у Магілёўскім культурна-асветным вучылішчы імя Н.К. Крупскай, а затым на бібліятэчным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага. На факультэце ў 1962 г. пачалася і яго навукова-педагагічная дзейнасць.

Да педагагічнай дзейнасці В.Е. Лявончыкаў паспяхова працаваў 8 гадоў ва ўстановах культуры Беларусі. Спачатку ён займаў пасаду інспектара раённага аддзела культуры, а потым – дырэктара Дамоў культуры Чэрыкаўскага і Слаўгарадскага раёнаў, загадчыка бібліятэкі вайсковай часткі (г. Мінск). Працуючы дырэктарам Дамоў культуры, В.Е. Лявончыкаў удзельнічаў у мастацкай самадзейнасці, як артыст танца і рэжысёр драматычнага калектыву прымаў удзел у абласных і рэспубліканскіх конкурсах, неаднаразова ўзнагароджваўся дыпломамі.

З кастрычніка 1962 г. пачалася педагагічная дзейнасць В.Е. Лявончыкава ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.М. Горкага: спачатку як выкладчыка, з 1964 г. – старшага выкладчыка і намесніка дэкана бібліятэчнага факультэта, з 1971 г. дацэнта кафедры бібліяграфіі, дэкана бібліятэчнага факультэта. З адкрыццём у 1975 г. Мінскага інстытута культуры пераведзены ў яго на пасаду дэкана бібліятэчнага факультэта, затым прафесара кафедры бібліяграфіі і загадчыка кафедры з 1983 г. Сёння прафесар В.Е. Лявончыкаў узначальвае кафедру тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

У навукова-педагагічнай дзейнасці выявіўся талент выдатнага педагога і арганізатара падрыхтоўкі кадраў. В.Е. Лявончыкаў першым у Беларусі абараніў не толькі кандыдацкую дысертацыю ў галіне бібліяграфазнаўства, але і стаў першым доктарам навук у гэтай галіне даследавання. Ступень кандыдата педагагічных навук была прысуджана маладому вучонаму за абарону дысертацыі на тэму «Агульная рэтраспектыўная бібліяграфія кніг Беларусі: гісторыя і тэарэтычныя пытанні» (1969 г.), падрыхтаваную падчас навучання ў аспірантуры Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры пад кіраўніцтвам вядомага бібліяграфазнаўца, прафесара А.Д. Эйхенгольца. У хуткім часе выйшла ў свет манаграфія «Белорусская ретроспективная библиография книг». У 1988 г. у Маскве В.Е. Лявончыкаў абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі саюзнай рэспублікі: тэарэтыка-метадалагічныя праблемы». Вынікі гэтага навуковага даследавання знайшлі адлюстраванне ў манаграфіі «Система библиографической информации союзной республики».

Кола навуковых інтарэсаў В.Е. Лявончыкава вельмі шырокае. Гэта тэарэтыка-метадалагічныя праблемы бібліяграфазнаўства, гісторыя беларускай бібліяграфіі, пытанні бібліятэчнай адукацыі, інфармацыйнай культуры, сацыяльных камунікацый і іншыя.

У тэарэтыка-метадалагічных даследаваннях на падставе сістэмнага падыходу ён упершыню абгрунтаваў прынцып дыферэнцыяцыі інфармацыйных патрэбнасцей рэгіёна на агульныя і спецыфічныя, што дазволіла ўдакладніць іх структуру, даследаваць сутнасць паняццяў «інфармацыйныя патрэбнасці рэгіёна» і «рэгіянальныя інфармацыйныя патрэбнасці»; акрэсліў тыпалогію рэгіёнаў, па якіх выдзяляюцца падраздзяленні бібліяграфіі, выявіў унутраныя супярэчнасці і знешнія фактары, якія дыферэнцыруюць зараджэнне і развіццё рэгіянальнай бібліяграфічнай інфармацыі; абгрунтаваў вельмі важнае палажэнне, што рэгіянальная бібліяграфія цалкам, у тым ліку ўсе яе разгалінаванні, падраздзяляюцца не на падставе «від – род», як лічылася раней у бібліяграфазнаўстве, а на падставе «частка – цэлае»; вызначыў крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці рэгіянальнай бібліяграфіі.

Вынікам працы над тэрміналогіяй у галіне бібліяграфіі, бібліятэчнай справы і кнігазнаўства з'явіліся ўпершыню выдадзеныя ў Беларусі «Руска-беларускі слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (у сааўтарстве з Л.А. Дзямешка) і «Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (у сааўтарстве з Л.А. Дзямешка і Р.І. Саматыя). У 2003 г. «Тлумачальны слоўнік...» выйшаў другім выданнем у выдавецтве «Вышэйшая школа» як сацыяльна значны даведнік і атрымаў першую прэмію Міністэрства культуры ў конкурсе лепшых прац у галіне бібліятэчнай справы.

Асобае месца ў даследаваннях В.Е. Лявончыкава займае гісторыя беларускай бібліяграфіі. Ён з'яўляецца заснавальнікам гэтай навуковай і вучэбнай дысцыпліны. У напісаных ім падручніках «Беларуская бібліяграфія. Агульны курс» (1981, 1991 гг.) і артыку-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лах адлюстравана ўзнікненне і развіццё айчыннай бібліяграфіі з часоў ВКЛ да сучаснага перыяду. Вялікая і карпатлівая праца вучонага над шматлікімі крыніцамі дазволіла абгрунтаваць гістарычныя перыяды беларускай бібліяграфіі і адлюстраваць развіццё яе інстытуцыянальнай структуры, раскрыць кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю, выявіць кола адметных беларускіх бібліёграфаў, ацаніць метадычную якасць многіх бібліяграфічных прац, набыткі ў развіцці тэарэтыка-бібліяграфічнай думкі і бібліяграфічнай адукацыі.

Тэматыка навуковых даследаванняў В.Е. Лявончыкава ў апошняе дзесяцігоддзе значна пашырылася. Акрамя бібліятэчна-бібліяграфічных, ён актыўна далучыўся да вывучэння такіх актуальных навуковых праблем, як фарміраванне інфармацыйнай культуры асобы, тэарэтычныя пытанні інфармацыйных рэсурсаў, навучанне і выхаванне студэнтаў у вышэйшай школе. В.Е. Лявончыкаў з'яўляецца ўдзельнікам і дакладчыкам многіх міжнародных канферэнцый, якія праводзіліся па гэтых праблемах у Маскве, Краснадары, Мінску. Ён апублікаў шмат навуковых артыкулаў па такіх складаных пытаннях, як інфармацыйная свабода і інфармацыйная бяспека ў сістэме бесперапыннай адукацыі, фарміраванне інфармацыйнага светапогляду ў час навучання ва універсітэце, тэарэтычныя праблемы інфармацыйных рэсурсаў, далучэнне студэнтаў да навукова-даследчай работы, выхаванне грамадзянскіх якасцей студэнтаў і інш.

Вынікі навуковых даследаванняў прадстаўлены ў шматлікіх дакладах на навуковых канферэнцыях і больш чым у 170 публікацыях, сярод якіх дзве манаграфіі, вучэбны дапаможнік, падручнік, тэрміналагічны і тлумачальны слоўнікі.

Са студзеня 2006 г. кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый прыступіла да распрацоўкі навуковай тэмы «Бібліятэка ў сістэме сацыяльнакультурнай камунікацыі». В.Е. Лявончыкаў з'яўляецца кіраўніком і ўдзельнікам у даследаванні гэтай важнай навуковай праблемы, якая ўключана ў дзяржаўны рэгістр навуковых тэм краіны. Ён зноў актыўна ўключыўся ў распрацоўку тэарэтычных праблем, якія тычацца місіі і функцый бібліятэкі ў сістэме сацыякультурных камунікацый.

Вядучы прадстаўнік сучаснай беларускай бібліяграфічнай думкі, прафесар В.Е. Лявончыкаў быў адным з арганізатараў аспірантуры ў БДУ культуры і мастацтваў, дзе выбіраўся старшынёй і намеснікам старшыні саветаў па абароне дысертацый на ступені кандыдатаў і дактароў навук. Пад яго кіраўніцтвам абаронены пяць кандыдацкіх дысертацый: В.І. Саітавай, дацэнта БДУ культуры і мастацтваў, Т.В. Кузьмініч, дацэнта, намесніка дырэктара НББ, І.У. Дрыга, намесніка начальніка Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення – начальніка упраўлення сацыякультурнай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, А.В. Прадзеінай, дацэнта, загадчыцы аддзела праблемна-арыенціраванай інфармацыйнай прадукцыі НББ, Ібрагіма Бадархана, грамадзяніна Сірыйскай арабскай рэспублікі, які зараз працуе дацэнтам Курдскага універсітэта (Ірак).

Вучоны стварыў навукова-педагагічную школу, вучні якой працуюць у Міністэрстве культуры, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Нацыянальнай кніжнай палаце, рэспубліканскіх галіновых, абласных, раённых, гарадскіх бібліятэках.

Прафесар В.Е. Лявончыкаў сёння выкладае базавыя вучэбныя курсы для студэнтаў: «Сацыяльныя камунікацыі», «Тэорыя інфармацыі і камунікацыі», «Метадалогія бібліяграфіі». Магістрантам і аспірантам дапамагае авалодаць метадалогіяй навуковых даследаванняў. Яго лекцыі і семінары выклікаюць нязменны інтарэс, раскрываюць перад моладдзю перспектывы навуковых пошукаў у галіне прафесійнай дзейнасці.

Значнае месца ў жыцці юбіляра займаюць грамадскія абавязкі. Ён многія гады з'яўляецца членам Вучонай рады універсітэта і Савета факультэта, быў намеснікам і галоўным рэдактарам міжведамаснага зборніка «Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства», членам рэдкалегіі часопісаў «Бібліятэчны свет», «Веснік БДУ культуры і мастацтваў», прэзідэнтам Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі. У 1993 г. стаў акадэмікам Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі (г. Масква), з 1995 г. – з'яўляецца членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі. Яго імя ўключана ў слоўнік «2000 выдатных вучоных свету» (2005 г.) Міжнароднага біяграфічнага цэнтра ў Кэмбрыджы і даведнік «Кто есть кто на академическом Олимпе» (2004 г.) Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі ў Маскве.

За плённую працу В.Е. Лявончыкаў узнагароджаны ордэнам СССР «Знак Пашаны», медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна», «Ветэран працы», Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. У намінацыях Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў ён неаднаразова займаў першае месца.

В.Е. Лявончыкаў карыстаецца заслужаным аўтарытэтам у навуковых колах і ў асяроддзі бібліятэчна-бібліяграфічнай грамадскасці Масквы, Санкт-Пецярбурга, Краснадара, Кіева і іншых гарадоў. Ён рэцэнзаваў шматлікія навуковыя работы, многія кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. У прыватнай бібліятэцы Васіля Емяльянавіча сярод кніг па філасофіі, сацыяльных камунікацыях, бібліяграфазнаўству і бібліятэказнаўству, інфарматыцы, гісторыі і культуры Беларусі, філалогіі, літаратуры ёсць выданні з прысвячэннямі ад бібліяграфазнаўцаў А.Д. Эйхенгольца, В.А. Факеева, Н.А. Слядневай, А.М. Бучанкова, М.М. Шчэрбы, Э.К. Бяспалавай, Н.М. Зіноўевай.

Мэтанакіраваны і настойлівы ў творчых пошуках, адказны за кожную справу, якую ўзначальвае, патрабавальны і ўважлівы ў зносінах з калегамі і студэнтамі, юбіляр поўны энергіі і новых творчых планаў. Штодзень яго чакае праца са студэнтамі, магістрантамі і аспірантамі, справы кафедры, факультэта, універсітэта. Пажадаем яму творчага натхнення і добрага здароўя.



«Бібліятэчны свет», 2007, №2(43). Рэгістрацыйнае пасведчанне №986. Заснавальнік: Беларуская бібліятэчная асацыяцыя. Выдавец: Выдавецкае ТАА «Красіка-Прынт». ЛВ № 02330/0133049 ад 30.04.2004 г. 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 15-1. Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 28.05.2007. Фармат 60x84/8. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 3,72. Гарнітура «Helios». Тыраж 2060 экз. Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №2330/0131528 от.28.07.2005 г. 220013, Беларусь, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Заказ № 1382
© «Бібліятэчны свет», 2007

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ